4.“Тут жыла сям’я Кандратовічаў!”
Наведванне аб’екта гісторыка-культурнай спадчыны “Фрагменты парку, канец XVIII стагоддзя”, аг. Пагародна

5. Выстава-продаж сувеніраў аддзела рамёстваў і традыцыйнай культуры ДУК “Воранаўскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”

Прыемных Вам прагулак і дзіўных адкрыццяў!

Экскурсія праводзіцца па папярэдніх заяўках!

Кошт правядзення экскурсіі супрацоўнікамі філіяла “Пагародзенскі цэнтр культуры і народнай творчасці”
для адной групы – 50 руб.00 кап.

Кошт 1 білета для індывідуальнага наведвання:
для дарослых - 1 руб. 50 кап.;
для дзяцей - 1руб.00 кап.

Даведкі па тэлефонах:
(8-01594) 2-14-64
(8-01594) 4-35-31

Сектар культуры Воранаўскага райвыканкама

ДУК “Воранаўскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці”

Турыстычны маршрут “Дарогаю продкаў”

Паслугу аказвае філіял “Пагародзенскі цэнтр культуры і народнай творчасці”

Воранава

Як прыгожа і мілагучна спявалі калісьці на вячорках дзяўчаты, калі пралі, ткалі або вышывалі ручнікі. Здавалася, у іх руках ажывалі ткацкія станкі і калаўроткі, нібы падыгрывалі сваім юным умеліцам. Гэтая чароўная мелодыя разлівалася на ўсю аколіцу…

Уявіце сабе, якія ў такой атмасферы прыгожыя вырабы атрымліваліся!

Напэўна, многія скажуць, што такія вечарыны даўно адышлі ў небыццё і ніхто ўжо зараз не збіраецца і не пяе песні, а тым больш — не прадзе, не тчэ. Гэта не так. Ёсць на Воранаўшчыне прыгожы куточак — аграгарадок Пагародна, дзе супрацоўнікі мясцовага сельскага цэнтра дасуга і народнай творчасці аб'ядналі вакол сябе тых дзяўчат, якія калісьці гуртаваліся на вячорках. Нягледзячы на тое, што сёння ім ужо за 70 год, яны па-ранейшаму збіраюцца, прыгожа спяваюць.

Вас гэта зацікавіла!? Тады запрашаем Вас наведаць наш турыстычны маршрут.

1. Наведванне аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны *"Касцёл Святога Георгія"*

1910 год, в. Асава



2. Наведванне помніка дзяўчатам-сувязісткам (аг. Пагародна). Літаратурна-музычная замалёўка "Их было четверо девчат"

3. Наведванне філіяла "Пагародзенскі цэнтр культуры і народнай творчасці":

- наведванне пакоя-музея ***"Тут Радзімы маёй пачатак";***

- майстар-клас ***"Навучыла мяне маці на кроснах ткаці"*** з удзелам народнага майстра Рэспублікі Беларусь Міхно Станіславы Вікенцьеўны;

- гульнёвая праграма Узорнага тэатра-студыі гульні ***"Гульнёвы кірмаш".***